

Складанне і камп'ютэрны набор:
Г.І.Францкевіч
Адказнны за выпуск:
В.М. Тварагаль

ДУК «Астравецкая раённая бібліятэка»

Адрас г. Астравец
пр-т Энергетыкаў, 2

Тэлефон: 8-015-91-79-2-90
Эл. пошта: ostrov_bibl@mail.ru

Аддзел маркетынгу і
сацыякультурнай дзейнасці

Серыя «Іх імёнамі названы
вуліцы Астраўца»

# Ушакевіч Іван Аляксандравіч

Астравец,
2022



**З успамінаў Станіславы Аляксандраўны Ушакевіч, маці І.А.Ушакевіча**

Нарадзіўся мой сын 27 мая 1929 г. Цяжкі быў час, але ўсе мае дзеці хадзілі ў школу. Вучыўся Ваня ў Даўкшышскай школе. Рос ён як і ўсе дзеці, але вызначаўся тым, што быў вельмі добрасумленным. Напэўна таму ў 18 год людзі абралі яго старшынёй сельсавета. Да 1948 г. ён працаваў фінансавым агентам у сельсавеце.

У канцы 1940-х гадоў, калі на Астравеччыне праходзіла калектывізацыя, в.Даўкшышкі вырашыла стварыць калгас. Іван Ушакевіч павінен быў прысутнічаць на сходзе, дзе вырашалася пытанне пра стварэнне калгаса. Сход праходзіў у хаце Ганны Ігнатаўны Рзун. Народу было многа. У разгар абмеркавання ў хату ўварваліся бандыты з банды Вікенція Карвэцкага. Яны выстралілі па І.Ушакевічу, М.Калгушкіну, М.Страцэўскаму, якія ездзелі ў прэзідыўме. Калі адзін з бандытаў наблізіўся да ўпаўшых актывістаў, смяротна параненны Калгушкін выстраліў у яго. Людзі разбегліся, у хаце нікога не заста-лося. Смерць аднаго з бандытаў прывяла ў лютасць астатніх. Яны хацелі забітых пасячы на кускі, але ім перашкодзілі, і бандыты толькі паспелі іх раздзець.

Калі ўсё гэта адбывалася, мяне не было дома. Я ездзіла да мужа, які працаваў старшынёй калгаса ў Ізабеліне. Я не магу перадаць таго жудаснага стану, які мяне ахапіў, калі я пачула, што майго сына забілі. Усё гэта адбывалася 9 лютага 1950 г. Яшчэ да гэтага страшнага здарэння мой сын, бывала, знаходзіў у сябе на стале запіскі ад бандытаў з пагрозамі. Іван быў вельмі добрым чалавекам і бандыты яго шкадавалі. За сваё кароткае жыццё ён быў узнагароджаны ў 1949 г. медалём «За працоўную доблесць». Але медаль і дакументы не захаваліся, страчаны. Такім медалём была ўзнагароджана і нявеста Івана Дуся, якая працавала настаўніцай у мяст. Гудагай.

У гэты вечар напярэдадні сходу ён да яе заязджаў. Прадчуваючы, што бандыты за ім сочаць, ён паведаміў Дусі, што будзе на сходзе ў Тракелях. Калі вечарам да яе заявіліся бандыты і спыталі, дзе Іван, яна хацела навесці іх на лжывы след і сказала,-што ён паехаў ў Даўкшышкі. Не ведала яна таго, што Іван сам паведаміў не тое месца сходу ў мэтах канспірацыі. Яшчэ я помню, калі ў нас начаваў Калгушкін, ён сказаў: «Неразумна было б загінуць тут, прайшоўшы вайну».

*Запісала А.Ф.Балтрукевіч.*